*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 41 (391) | Чацвер. 31 снежня 1959 года | Цана 10 кап.

## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ШАСЦІДЗЕСЯТЫ

Апошнія хвіліны 1959 года... Хутка Крамлёўскія куранты праб'юць дванаццаць разоў, і ў свае правы ўступіць у Новы, 1960 год.

Бадай што, няма на зямным шары народу, у якога не было б выдатнага звычаю — у ноч перад Новым годам азірнуцца на пройдзены шлях і памарыць аб будучам, аб шчасці. Не будзем парушаць гэтай традыцыі і мы

У нас ёсць што ўспомніць, ёсць чым ганарыцца. У вытокаў 1959 года стаіць XXI з'езд нашай слаўнай партыі, які акрэсліў перад савецкім народам шляхі да пабудовы камунізма. А колькі было іншых знамянальных падзей, колькі выдатных перамог атрымана ўсяго толькі за адзін год. Місія міру Мікіты Сяргеевіча Хрушчова ў ЗША, спуск на ваду атамнага ледакола «Ленін», шэраг перамог над касмічнай прасторай, які завяршыўся аблётам савецкай касмічнай лабараторыі вакол Месяца і фатаграфаваннем яго адваротнага боку, фатаграфаваннем, якое па сваёй дасканаласці, па тэхнічнай вышыні, глыбока ўразіла чалавецтва.

1959 год знамянальны для нас і тым, што ён з'явіўся першым годам першай сямігодкі. Савецкі народ выдатна папрацаваў на ўсіх яе франтах. Мы сталі жыць лепш, м... сталі жыць больш багата. І ...а — закон нашага жыцця.

Мы смела глядзім у будучае, ...верым у яго, мы ўпэўнены ў ім. Калі працоўны ў краіне капітала з трывогай думае аб тым, што прынясе яму, яго сям'і, яго бюджэту новы год — мы ўпэўнены, 1960 год прынясе нам новыя поспехі і далейшае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту, далейшы прагрэс тэхнікі, новую веліч здзейсненых планаў.

Сёння за святочным сталом сабяруцца рускі і мардвін, украінец і латыш, беларус і казах, малдаванін і татарын, армянін і грузін— уся братэрская сям'я нашага многанацыянальнага Саюза. Мы жывём дружна і дружна працуем. Таму самыя дзёрзкія мары чалавецтва ажыццяўляюцца ў нас, у краіне пераможшага сацыялізма, і нават крылы чалавечай фантазіі часам бываюць бяссільнымі, і нам цяжка ўявіць, што можа аказацца не пад сілу савецкаму народу, не пад сілу нашай партыі: ці то палёт на Месяц, ці то змяненне прыроды Сібіры. Не, нам усё магчыма, усё пад сілу.

Таму мы ўпэўнена глядзім у будучае і радасна вітаем наступленне Новага, 1960 года, другога года сямігодкі, які з'явіцца яшчэ адным крокам па шляху да камунізма.

Дык добры дзень, тысяча дзевяцьсот шасцідзесяты!

З Новым годам вас, дарагія сябры, з новым шчасцем!

## НАВАГОДНЯЕ

*Паволі заціхае мерны бой*
*Далёкае заснежанай планеты.*
*Яловай пахне свежаю смалой*
*І ў цяпле распаранай ігліцай...*
*За гэты цэлы непачаты год*
*Бліжэй да мэты ступім мы*
*наперад.*

*Давайце на ўваходзінах яго*
*Памарым за святочнаю вячэрай!*
*Сваё сумленне—кожнаму суддзя,*
*Ды тут якраз і доказаў не трэба.*
*Калі мы жыта сеем загадзя,*
*То будуць гнуцца зноў сталы*
*ад хлеба.*

*Сакрэтамі да самага відна*
*Дзяўчат займаць*
*хлопцы-непаседы.*
*А, значыць, будзе ў Новым*
*ні адна,*

*Як і ў старым, вясёлая бяседа.*
*Ды на Купалле плёсы ад вянкоў*
*Зноў захмялеюць свежай*
*мятай-рутай...*

*Да самых дальніх зорак-светлякоў*
*Мы пракладзём касмічныя*
*маршруты.*

*І падарожжа — казачны палёт—*
*Не напаткае ніякое ліха,*
*Бо раставаць пачаў «халодны*
*лёд»,*

*Каб на зямлі было спакойна, ціха.*
*Хай лепш аб дол стараляюць*
*жалуды.*

*І скрозь гараць асеннія пажары.*
*Давайце і ў наступныя гады*
*Мы будзем разам, людзі, жыць*
*і марыць!*

**У. ПАЎЛАЎ.**




## НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА ГОДА

Гістарычнаму факультэту споўнілася 25 год.

Адбыўся ўрачысты вечар, на якім даклад аб рабоце факультэта зрабіў дэкан тав. Савачкін. Затым з віншавальнымі прамовамі выступілі студэнты і выкладчыкі універсітэта, а таксама прадстаўнікі грамадскіх і дзяржаўных устаноў рэспублікі. Сіламі мастацкай самадзейнасці універсітэта быў дадзен канцэрт.

У корпусе, дзе займаюцца гісторыкі, арганізаван фотастэнд, прысвечаны 25-годдзю факультэта, і выстаўка навуковых прац вучоных і студэнтаў гістфака.

* * *

Ва універсітэце адбылася сустрэча з заслужаным артыстам РСФСР Юрыем Дуравым. Ён расказаў аб цыркавых прадстаўленнях, аб тым, як дрэсіруе чацвераногіх артыстаў; адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.

* * *

Бібліятэка юрыдычнага факультэта арганізавала кніжна-ілюстрацыйную выстаўку, прысвечаную снежаньскаму Пленуму ЦК КПСС.

**В. КАПЦІЛОВІЧ.**

## Навагоднія віншаванні

У сувязі з наступленнем Новага года ва універсітэт паступілі віншавальныя тэлеграмы ад калектыву інстытута навуковай і тэхнічнай інфармацыі Кітая, ад Астранамічнага савета Акадэміі Навук СССР, Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, Петразаводскага дзяржаўнага універсітэта, Казахскага дзяржаўнага універсітэта імя С. М. Кірава і ад іншых навуковых устаноў і ВНУ краіны.



